Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Грыцкевіцкая сярэдняя школа”

# УРОК БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў 5 КЛАСЕ
# “ПРАВАПІС РАЗДЗЯЛЯЛЬНАГА МЯККАГА ЗНАКА І АПОСТРАФА”

Мянько Таіса Георгіеўна,

настаўнік беларускай мовы і літаратуры, класны кіраўнік 8 класа

Грыцкевічы 2024

Раздзяляльны мяккі знак і апостраф
Урок беларускай мовы ў 5 класе

Тып урока: урок вывучэння новага матэрыялу.
Задачы:

- абудзіць пазнавальную цікавасць да тэмы;
- дапамагчы засвоіць правапіс раздзяляльнага мяккага знака і апострафа;
- удасканальваць раздзельнае і злітнае вымаўленне зычных з наступным
- галосным;
- садзейнічаць развіццю камунікатыўных уменняў вучняў;
- садзейнічаць развіццю арфаграфічнай пільнасці;
- развіваць лексічны і фразеалагічны запас вучняў;
- выхоўваць беражлівыя адносіны да навакольнага асяроддзя.

Абсталяванне: Беларуская мова: вуч. дапам. для 5-га кл. агульнаадукац. устаноў з бел. і рус. мовамі навучання; карткі з тэкстам, заданнямі.

Ход урока

I. Арганізацыйна-матывацыйны этап.

Аднойчы вучні звярнуліся да свайго настаўніка з пытаннем, які дзень тыдня самы спрыяльны, каб пачаць новае жыццё, каб стаць паспяховым, удалым, шчаслівым. Як думаеце, які дзень назваў настаўнік? (Сёння). Раю і вам не адкладваць на заўтра тое, што можна зрабіць сёння.

А зараз выберыце фразеалагізм, які возьмеце з сабой на ўрок.

З рук вон
Закасаўшы рукавы
Абедзвюма рукамі
Спусціўшы рукавы
Чужымі рукамі
Не пакладаючы рук

II. Актуалізацыя ведаў вучняў.

– Гульня “ТАК” – “НЕ”.

1.Змякчальны мяккі знак пішацца для абазначэння цвёрдасці зычных гукаў.(Не).

2.Змякчальны мяккі знак пішацца для абазначэння мяккасці зычных гукаў на канцы слова.(Так).

3. Змякчальны мяккі знак не пішацца пасля зацвярдзелых.(Так).

4. Змякчальны мяккі знак пішацца пасля літар б, м, п, в, ф, д.(Не).

5. Змякчальны мяккі знак пішацца паміж падоўжанымі зычнымі.(Не).

6. Змякчальны мяккі знак пішацца пасля мяккага л перад цвёрдым або мяккім зычным.(Так).

7. Зычныя гукі паводле ўдзелу голасу і шуму падзяляюцца на звонкія, глухія і санорныя.(Так).

8. Санорныя гукі в, л, н, м, р, ў, й не маюць парных глухіх.(Так).

9. Гукі ч, ж звонкія.(Не).

10. На канцы слоў Гомель, Лепель, Любань, Капыль, Смаргонь, Скідзель пішацца мяккі знак.(Так).

– Індывідуальная праца (адзін вучань на дошцы, адзін – на кап'ютары выконвае інтэрактыўнае заданне).

Далонь, пісаць, пісменнік, насенне, песня,жолуд,плашчь, карэньне,пен, зьвяры.

III. Матывацыйны этап.

**Павільён** **надвор'е**

**Ільіч** **аб'ява**

**Льюцца** **п'юць**

Пры дапамозе ваблака слоў паспрабуем сфармуляваць тэму ўрока.

А зараз, выкарыстоўваючы словы на дошцы, сфармулюем задачы нашага ўрока

Ведаць

Умець

Прымяняць

Задачы вызначаны. Возьмемся за працу. Спадзяюся, што сёння мы не будзем ***сядзець склаўшы рукі, біць лынды, ганяць сабак, лавіць варон, ліцьکракадзілавы слёзы, а закасаем рукавы і папрацуем не пакладаючы рук.*** Гэта значыць якасна. Які аднакаранёвы назоўнік можна падабраць? – Якасць. А які ў нас гэты год? Як пішацца слова якасць? Чаму? А зараз давайце звернемся да тэкста.

Жыў-быў у адным вялікім лесе Лось. Жыў ён вольна, весела і цікава. Надта любіў Лось напіцца ўдосталь чыстай сцюдзёнай вадзіцы з ручайка.

Але аднойчы ён прыбег і заўважыў, што хтосьці накідаў шмат усякага смецця. Напіўся Лось і адразу адчуў сябе блага. Пабег ён хутчэй па свае любімыя лекі ў ельнік – па грыбы мухаморы.

А ў гэты час па лесе блукаў Пеця Васільеў і збіваў кійком мухаморы. Ён не ведаў, што мухаморы – не толькі атрута, што гэтымі грыбамі лечацца многія звяры.

Ледзьве знайшоў хворы Лось у тым лесе апошні мухамор. З'еў яго і праз хвіліну паздаравеў.

Таму ніколі, сябры, не шкодначайце ў лесе. Не рвіце там кветкі і не тапчыце грыбы, якія лічыце атрутнымі. У лесе няма нічога лішняга! (З часопіса "Лесавічок")

– Паслухайце тэкст і падумайце, да каго звяртаецца хлопчык, каму адрасуецца ліст.

– Як прырода дапамагае сваім жыхарам?

– Хто атруціў Лася?

– Ці можам мы сцвярджаць, што хлопчык, які збіваў мухаморы, таксама вінаваты ў хваробе Лася?

– Ці ведаеце вы, што мухаморы з’яўляюцца лекамі для звяроў?

– Што хоча нам параіць аўтар пісьма?

– Патлумачце значэнне слоў: блукаць, шкоднічаць, лекі, атрута , смецце, сцюдзёны, хворы, блага, удосталь, пабегчы па лекі, блукаць па лесе. (НА ДОШЦЫ)

– Знайсці ў тэксце словы з мяккімі зычнымі, растлумачыць правапіс мяккага знака.

IV. Інфармацыйна-пошукавы этап

1.Зварот да новай тэмы.

Казка выклікала цікавасць. Хлопчык дакладна, вобразна данёс да нас вельмі важную думку. Але разам з гэтым мы павінны таксама вучыцца гэтак жа прыгожа афармляць свае выказванні. Калі мы складаем лісты або выказваем свае думкі ў вуснай ці пісьмовай форме, мы павінны клапаціцца, каб наша выказванне было прыгожым, пісьменным. Гэту задачу дапаможа нам вырашыць тэма сённяшняга ўрока: мы пазнаёмімся са знакамі, якія іншы раз называюць сябе пагранічнікамі – раздзяляльным мяккім знакам і апострафам, навучымся правільна вымаўляць і пісаць словы, у якіх раздзяляльны мяккі знак і апостраф. Знайдзіце ў тэксце такія словы (з’еў, Васільеў).

(Апостраф ад грэч. – звернуты ўбок, назад)

– Вызначце, якія гукі абазначаюць ётавыя галосныя ў гэтых словах.

– Пасля якіх зычных яны пішуцца?

– Які вывад можна зрабіць?

2. Зварот да матэрыялу падручніка (стар. 54)

– Аб чым мы з вамі яшчэ не гаварылі?

3. Практычная работа

а) Вусная работа. Практыкаванне 116. Растлумачыць правапіс раздзяляльнага мяккага знака і апострафа.

б) Гульня “Рэшата”(заданні на картках ). Прасейце словы з апострафам (I варыянт), з раздзяляльным мяккім знакам ( II варыянт), са змякчальным мяккім знакам (III варыянт).

(Тры вучні працуюць ля дошкі, клас выконвае заданне па варыянтах) :

Аб..езд, міл..ярд, ляс..нік, л..дзіна, міл..ён, шчаў..е, п..еса, павіл..ён, паштал..ён, аб..ём, грыл..яж, сям..я, ал..пініст, л..е, аген..чык, з..ява, дз..мухавец, мядз..ведзь, вераб..і, бац..кі, дз..веры, кас..ба, з..есці, ц..вёрды,звяр..ё, дзядз..ка, батал..ён, пал..цы, пес..ня, восем..,рэл..еф,воз..ме.

Дадатковае заданне: растлумачыць значэнне слова альпініст і скласці з ім сказ.

в) "Перакладчыкі". Перакласці на беларускую мову словы і патлумачыць іх правапіс.

Голубь, семья, бильярд, объект, соловьи, песенка, копьё,степь, объезд, семь, редька, накипь.

V. Фізкультхвілінка + трэнажор для вачэй.

Два нахілы – як цудоўна!
Мы трымаем спіны роўна.
Рукі ўверх, затым ўбок,
І да сябра злева – крок.
Усміхнёмся сябру справа
І займацца будзем справай:
Мову родную вучыць
І сяброўствам даражыць.

VI. Арфаграфічная хвілінка (інтэрактыўнае заданне на камп'ютары) – Вяргіня, лілея, святаяннік, падбел, пялёстак, кветнік, дзядоўнік, піяніна, віяланчэль, гладыёлус, язмін, балерына. Пасля выканання на камп'ютары надпіс: "У цябе ўсё атрымалася! Гэты музычны падарунак для цябе!" А ці ведаеце вы, хто аўтар (кампазітар) гэтай чароўнай музыкі? Назавіце яшчэ назвы кветак з ь, '.

5. Праца з фразеалагізмамі (практ. 119)

– Зрабіце гукавы запіс слова "з'ехаць".

– Складзіце і запішыце сказ з адным выразам (на выбар).

VII. Кантрольны этап

Тэст для ўзаемаправеркі :

1. Дапамажыце апострафу стаць у тыя словы, дзе ён патрэбен.

Ад..езд, батал..ён, пад..езд.

2. Выпішыце словы, у якіх мяккі знак раздзяляльны.

Моль, Ульяна, Васільевіч.

3. Адзначце словы, у якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі :

а) дзме ; б) б'е; в) міл'ён; г) пад'ехаць; д) сьнег.

4. Запішыце словы па-беларуску:

а) подъём; б) ателье; в) семья; г) здоровье .

Адказы: 1 – ад’езд, пад’езд; 2 – Ульяна, Васільевіч; 3 – а, в, д; 4 –пад’ём, атэлье, сям’я, здароўе.

VIII. Падагульненне. Запоўніце кластар па тэме сённяшняга ўрока.

Ілья, Ільіч, мільярд, мільён,
Більярд, Ульяна, паштальён.
Мы пішам так і толькі так –
праз ………………………… (раздзяляльны мяккі знак)
Раз’яднаць, ад’ехаць, з’ява,
З’езд, раз’юшаны, аб’ява.
Тут……………. – важны знак: (апостраф)
Без яго ні так, ні сяк.

IX. Выстаўленне адзнак

X. Рэфлексія

1.Зварот да задач урока.

Сёння на ўроку мы:

Успомнілі…

Даведаліся…

Навучыліся….

Ахарактарызуйце, калі ласка, пры дапамозе фразеалагізмаў сваю працу на ўроку і працу аднаго з аднакласнікаў.

XI. Заданне на дом: §16, практ. 121